**А. А. Макарэвіч**

# ПРАБЛЕМНА-ТЭМАТЫЧНЫ ДЫЯПАЗОН СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ КАЗКІ Ў ТВОРЧАСЦІ ЭЛЕНЫ КАСАНА І АЛЕСЯ БАДАКА

Літаратурная казка – адзін з вядучых жанраў дзіцячай літаратуры, сярод галоўных задач якога вылучаецца адлюстраванне актуальных праблем грамадства.

Ва ўсе часы важнай функцыяй казак была перадача асноўных маральных каштоўнасцей і правілаў паводзін маладому пакаленню. У сваім зборніку “Незвычайнае падарожжа ў Краіну Ведзьмаў” А. Бадак надае галоўную ўвагу менавіта гэтай тэме. У цэнтры сюжэта паўстае праблема ўзаемаадносін паміж пакаленнямі: галоўныя героі не дапамагаюць бабулі, якая аказваецца ведзьмай і насылае на іх хваробы. У казках “Хатка на ўскрайку лесу” і “Пластмасавы чалавечак” аўтар падкрэслівае важнасць такіх рыс характару, як адважнасць, самаахвярнасць, дапамога малодшым. У творах “Краіна гультаёў”, “У замку Вірынеі”, “На чужым гарышчы” А. Бадак высмейвае такія адмоўныя рысы, як гультайства, неахайнасць, няветлівасць. У казках “Старая варона” і “Перамены ў палацы” ўздымаецца тэма ўлады: героі казачных краін гатовыя адмовіцца ад сваіх уласных жаданняў і змушаныя жыць па непрыемных для іх правілах праз страх згубіць магчымасць кіраваць астатнімі. Акрамя гэтага, у зборніку А. Бадака закранаецца праблема гендарнай няроўнасці (казка “Краіна сонечных зайцоў”).

У зборніку Э. Касана “Кот ведзьмы” асноўная ўвага надаецца такім філасофскім тэмам, як сэнс жыцця, каханне, сяброўства. У казцы “Гісторыя

Траста” пісьменніца закранае праблему ўзаемаадносін паміж людзьмі, якія не могуць змяніць свае звычкі і стыль жыцця нягледзячы на пачуцці. У творы “Пра ведзьмаў і дрэвы” актуалізавана праблема няшчырасці ва ўзаемаадносінах, калі героі не раскрываюць свой сапраўдны характар і жывуць ілюзіямі. У казцы “Кот і ведзьма ідуць на прагулку” асэнсоўваецца тэма пошуку сябе і сэнсу жыцця. Аўтарка заўважае, што галоўная мэта чалавека – быць шчаслівым. Акрамя гэтага, падкрэсліваецца ідэя, што любое жыццё вартае існавання. Скразной для ўсяго зборніка з’яўляецца важнасць тэмы гарманічных адносін паміж прыродай і чалавекам.

Трэба падкрэсліць, што ў абодвух зборніках не назіраецца строгі падзел на чорнае і белае, дабро і зло, што з’яўляецца важнай рысай літаратурнай казкі. Многія героі аб’ядноўваюць у сабе адмоўныя і станоўчыя рысы: спачатку яны высмейваюць дрэнныя ўчынкі іншых, але потым іх жа і паўтараюць. Такім чынам, мы можам адзначыць, што ў сучаснай літаратурнай казцы знаходзяць адлюстраванне тэмы і праблемы, актуальныя для сучаснага грамадства, а таксама ўласныя погляды аўтара. У беларускай літаратурнай казцы (А. Бадак) большая ўвага надаецца тэме маральных каштоўнасцей і правіл паводзінаў, у той час як у іспанскай літаратурнай казцы (Э. Касана) відавочны зварот да ўнутранага свету чалавека і такіх адвечных тэм, як каханне, шчасце, сэнс жыцця.